## Насустрач 50-годдзю Савецкай улады

# І ВЁСКА НЕ ТАЯ, І ЛЮДЗІ НЕ ТЫЯ

Вёска Мазалі. Адкуль пайшла назва нават старажылы дакладна не могуць сказаць. Аднак знаёмства з гісторыяй вёскі гаворыць аб тым, што назва гэта дадзена ёй не выпадкова. Дарэвалюцыйная вёска Мазалі —самая бедная і адсталая ў былым Чапліцкім павеце. Зямельныя надзелы сялян былі невялікімі. З усіх бакоў іх падпіралі масівы ворыва памешчыка Прашынскага. Сяляне жылі нібы на востраве.

Усякімі праўдамі і няпраўдамі памешчык адабраў ад сялян значныя ўчасткі ворыва. Шматгадовая судовая справа, узнятая жыхарамі вёскі супраць памешчыка, закончылася ў яго карысць. Напярэдадні рэвалюцыі,выведзеныя з цярпення, сяляне захваляваліся. Для ўціхамірвання сялян прыбыў эскадрон казакаў.Расправа была кароткай: адных высеклі розгамі, другіх аштрафавалі, а больш непакорных адправілі на катаргу, а маёмасць канфіскавалі.

Аб гаротным жыцці сялян і гаварыць не прыходзіцца. З цямна да цямна палівалі потам вузкія палоскі зямлі, а ледзь зводзілі канцы з канцамі.

Жылі ўпрогаладзь, не ведалі пісьменнасці, гнулі спіну на памешчыка.

І толькі Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя пазбавіла сялян ад рабства, голаду і цэмры. Ленінскі дэкрэт аб зямлі дайшоў і да нашай вёскі.Быў выбран зямельны камітэт, які ўзначаліў Іван Герасімовіч. З дапамогай камітэта была падзелена зямля.

Толькі нядоўга дыхалі поўнай грудзю сяляне. У лютым 1918 года вёску, як і іншыя беларускія землі, акупіравалі немцы. Вярнуўся назад памешчык і прад'явіў сялянам іск за заараную канюшыну ў суме 80 тысяч рублёў. Аднак спагнаць з сялян гэтую суму грошай памешчыку не ўдалося,бо хутка Чырвоная Армія выгнала і акупантаў, і памешчыкаў з нашай зямлі.

У пачатку трыццатых гадоў бяднейшыя сяляне і былыя батракі вёскі арганізавалі калгас. Гаспадарка развівалася,набірала сілы з кожным годам, але далейшаму яе росту перашкодзіў напад фашысцкай Германіі на нашу краіну. Жыхары вёскі са зброяй у руках абаранялі заваёвы Вялікага Кастрычніка на франтах Айчыннай вайны і партызанскіх атрадах, і многія з іх аддалі сваё жыццё за Радзіму.

Не шкадуючы сіл аднаўлялі калгаснікі разбураную вайной сваю гаспадарку.З кожным годам яна падымалася ўгару. Але асабліва шпаркі рост і ўмацаванне эканомікі калгаса адбылося ў апошнія гады.Ператварэнне ў жыццё рашэнняў сакавіцкага (1965 г.) і майскага (1966 г.) Пленумаў ЦК КПСС вывела гаспадарку на новыя рубяжы. Варта сказаць, што грашовы даход калгаса ў параўнанні з 1960 годам узрос летась амаль у 2 разы і склаў 369,4 тысячы рублёў.

Павысілася культура земляробства. А гэта спрыяе росту ўраджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур. Павелічэнне валавых збораў прадуктаў раслінаводства дазволіла ўмацаваць кармавую базу, пераадолець адставанне ў жывёлагадоўлі. Толькі ў мінулым годзе ў параўнанні з папярэднім пагалоўе буйной рагатай жывёлы на фермах калгаса павялічылася на 150 галоў, у тым ліку кароў на 50 галоў. Значна ўзрасла і прадуктыўнасць жывёлагадоўлі. Калі ў 1962 годзе надой малака на фуражную карову склаў 1328 кілаграмаў, то ўжо летась было надоена па 1718 кілаграмаў малака ад каровы.

Калгас штогод адпускае значныя грашовыя сродкі для будаўніцтва вытворчых, культурна-бытавых і жывёлагадоўчых памяшканняў. Цяпер будуюцца клуб, кароўнік на 200 галоў і многа іншых памяшканняў. Многа пабудавана і будуецца жылля.

Непазнавальна змянілася жыццё нашых калгаснікаў. Абстаноўка ў кватэрах калгаснікаў мала чым адрозніваецца ад абстаноўкі гарадскіх кватэр. Тут прыгожая і зручная мэбля, маецца ў дастатку рознага посуду, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, пральныя і швейныя машыны. Калгаснікі носяць адзенне апошніх мод і фасонаў. Ды гэта і не дзіўна. Аплата працы калгаснікаў узрасла ў параўнанні з 1960 годам больш чым у два разы. Летась на адзін чалавека-дзень выдана ў сярэднім па калгасу па 2,62 рубля.

За апошнія гады ў калгасе выраслі сапраўдныя майстры сваёй справы. Гэта трактарысты В. М. Лобан, В. І. Усовіч, шафёры Н. В. Новік, Мастовіч, брыгадзір трактарнай брыгады Л. В. Усовіч, механік А. С.Усовіч і многія іншыя. Добрымі арганізатарамі калгаснай вытворчасці з'яўляюцца брыгадзіры Богдан А. З., Герасімовіч І. А., Усовіч А. К.

Народная школа на сорак месц у нашай вёсцы была адкрыта перад пачаткам рэвалюцыі. У ёй вычуліся пераважна дзеці багатых. Цяпер жа васьмігадовую школу наведваюць больш двухсот дзяцей. Многія калгаснікі набылі вышэйшую адукацыю і працуюць цяпер у розных галінах народнай гаспадаркі. Так, напрыклад, Валянцін Астроўскі, Яўген Саковіч, Мікалай Герасімовіч працуюць інжынерамі, Аркадзь Адамавіч і Іван Аляксеевіч Усовічы скончылі ваенныя акадэміі і служаць у Савецкай Арміі, ёсць настаўнікі, урачы і іншыя спецыялісты.

Слаўны 50-гадовы юбілей Савецкай улады калгаснікі сельгасарцелі «Чырвоная ніва» сустрэнуць новымі поспехамі ва ўздыме ўсіх галін гаспадаркі, паспяхова выканаюць узятыя на юбілейны год сацыялістычныя абавязацельствы.

**Ф. ГЕРАСІМОВІЧ,**
**калгаснік.**